УДК 21/29-17

# Шматзначнасць сакральнага

Анцыповіч М. В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Сакральнае – духоўнае ўтварэнне, якое адпавядае псіхалагічным патрэбам і неўсвядомленным імкненням чалавека да пошуку сэнсажыццёвых каштоўнасцей. Тры фактары спрыяюць сакралізацыі: адчуванне аб існаванні нейкіх невядомых і непадуладных для чалавека сіл, якія кіруюць светам і лёсамі людзей; патрэбнасць чалавека ідэнтыфікаваць самога сябе з якой – небудзь супольнасцю, якая здольна супрацьстаяць гэтым сілам; сугестыўныя ўплывы слова (мовы) на паводзіны людзей.

Сацыяльна – філасофскі падыход да феномена сакральнага абумоўліваецца супрацьлегласцю сакралізацыі, як эфектыўнага і надзейнага спосаба адзінства агульнасці, і дэсакралізацыі, як рэакцыі на сацыяльны кантроль: зняццё святых запаведных сэнсаў, дэміфалагізацыі і абміршчэння тых сфераў жыцця грамадства і асобы, якія раней былі сакральнымі.

У агульным падыходзе дэсакралізацыя атаясамліваецца з сакралізацыяй і пагэтаму цалкам дэсакралізаванае грамадства не існуе. Наадварот, магчыма назіраць пастаянныя хістанні сакралізацыі і дэсакралізацыі ў розных сферах жыцця, як выражэнне спецыфічнай нормы сацыяльнай дынамікі.

Сакральнае мае сваю амбівалентнасць: спасцігаючы законы светабудовы, чалавек падчас экстрапалюе на акаляючы свет, у тым ліку аж да касмічных маштабаў, уласныя якасці, жаданні і структуры. Адначасова ствараючы рэчывавы свет, чалавек надзяляе яго сэнсамі і значэннямі, якія выходзяць за межы звычайнай штодзённасці.

У гісторыі культуры на кожным этапе развіцця грамадства дамінуючую ролю ў сацыяльнай арганізацыі выконваюць розныя інстытуцыі, накшталт царквы, манархіі, арміі і г. д. Для падтрымання іх ствараюцца ідэалогіі, задача якіх сфармаваць уяўленні аб бясспрэчнай значнасці і каштоўнасці гэтых інстытутаў. А гэта немагчыма выканаць на базе толькі рацыянальных падыходаў і партрабуе дадаткова ірацыянальна – сакральнай асновы.

Манархія як форма кіравання (на сённяшні дзень існуе 30 краінах у тым ліку 12 еўрапейскіх), дэтэрмінуе сакральны статус яе носьбіта, а таксама звязана з пэўнымі рытуаламі, і ў першую чаргу, з каранацыяй. Сакральнае з'яўляецца асновай легітымнасці манархічнай улады, а таксама сродкам пераадольвання палітычных крызісаў.